Основные педагогические идеи преподавателей заключаются в следующем: изобразительное искусство включает в себя богатейший воспитательный потенциал, содействует формированию духовности и культуры подрастающего поколения.

Эффективное воздействие на формирование национального самосознания возможно при синтезе всех жанров народного творчества. Возвращение к духовным истокам, возрождение национальных традиций для решения вопросов в сфере культуры и духовности — это составная часть проблемы воспитания нравственности и духовности.

При активном внедрении в практику новых идей, которые формируют культурную личность, полезно использовать народную мудрость, заложенную в фольклоре, национальных традициях и обычаях. Народное творчество — неиссякаемый источник, неисчерпаемое богатство педагогики, имеющее огромное воспитательное и познавательное значение.

**Список цитируемых источников**

1. Коновалов В. Н. Словарь по политологии. М. : РГУ, 2010. 235 с.
2. Философский энциклопедический словарь / под ред. Ильичев Л. Ф. [и др.]. — М. : Совет. энцикл., 1983. 836 с.
3. Игрушка как отражение культуры нации в воспитании детей. URL: http://www.rukukla.ru/кукла%20из%20льна/ (дата обращения: 24.11.2015).

УДК 008: 821.161.3(092 Я.Чачот)

**У. А. Жылко**
*Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы», Гродна*

# ВЫЯЎЛЕННЕ АБ'ЕКТАЎ БЕЛАРУСКАЙ ДУХОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ Ў ТВОРЧАЙ СПАДЧЫНЕ ЯНА ЧАЧОТА

**Уводзіны.** На сёння праблемы духоўнай культуры набываюць незвычайную актуальнасць, што непасрэдным чынам звязана з асаблівасцямі культурнай эпохі. Сучасная полікультурная прастора характарызуецца канфліктнай і сэнсавай насычанасцю, мультыкультуралізмам, сінтэзам традыцыйных і ліберальных каштоўнасцей, маргіналізацыяй, праявамі нігілізму і эскайпізму. У сувязі з гэтым вельмі актуальнай прадстаўляецца выяўленне дэтэрмінант, якія абумоўліваюць засваенне каштоўнасцей нацыянальнай культуры. У рашэнні пастаўленай задачы важную ролю адыгрывае духоўная культура XIX ст., якая задала аснову сістэмнай цэласнасці і самабытнасці сучаснай нацыянальнай культуры, паколькі выступіла ў якасці пачатковага этапа фарміравання нацыі. Усё акрэсленае дыктуе неабходнасць паглядзець на айчынную гісторыю і культуру з пазіцыі духоўна-маральнага пачатку. У гэтым дачыненні апраўдана чарговы раз звярнуцца да даследавання феномена беларускага рамантызму XIX ст., паколькі рамантычная творчасць пісьменнікаў можа прапанаваць багаты матэрыял для выяўлення і асэнсавання аб'ектаў духоўнай культуры.

**Асноўная частка.** Рамантычныя тэндэнцыі з'яўляюцца вызначальнымі ў беларускім мастацкім працэсе XIX ст. Рамантызм аказаў уплыў на станаўленне новай беларускай літаратуры і выразна ўвасобіўся ў творчасці яе прадстаўнікоў. Пачатковы перыяд у вывучэнні духоўнай культуры беларусаў вылучае магутную постаць Яна Чачота, які ў свой час не толькі займаўся збіраннем і выданнем беларускіх народных песень, але і ствараў арыгінальныя творы на аснове вуснапаэтычнага элемента. Літаратурныя творы пісьменніка ўключаны ў цэлую сістэму культурных каардынат, яны быццам бы сатканыя з мноства культурных сэнсаў. У сваёй творчасці Я. Чачот імкнуўся вызначыць першавытокі беларускай культуры, спасцігнуць яе самабытны характар, сутнасць этнанацыянальнага духу. Гэта сапраўды рэфлексійная дзейнасць творцы пераўтварылася ў своеасабліва выказаныя ім ідэі, паняцці, каштоўнасныя арыентацыі, якія набываюць форму аб'ектаў духоўнай культуры, арыентуюцца на звышпачуццёвы пачатак пазнання. Менавіта гэта акалічнасць прадстаўляе выдатную магчымасць выяўлення і аналізу аб'ектаў духоўнай культуры.

Пад аб'ектамі духоўнай культуры мы будзем разумець культурныя феномены, выражаныя ў ідэальнай форме: ідэі, вобразы, ідэалы, каштоўнасці. У межах нашай працы мы спынімся непасрэдна на такіх аб'ектах, як ідэалы, каштоўнасці і каштоўнасныя арыентацыі. Выяўленыя ў творчасці Я. Чачота аксіялагічныя элементы прадстаўлены групамі аксіялагем, класіфікаваных у адпаведнасці з тым, захаванне і ўстойлівасць якога аспекта жыццядзейнасці чалавека дадзеная каштоўнасць забяспечвае:

1) каштоўнасці, якія рэгулююць існаванне чалавека ў супольнасці, грамадстве, накіраваныя на пазнанне рэчаіснасці (біблейскія запаведзі, прынцыпы паводзін, зносін і дзейнасці ў адпаведнасці з хрысціянскай мараллю: любоў як галоўнае маральнае пачуццё ў адносінах да людзей, духоўна-маральныя мэты, матывы, устаноўкі, звязаныя з дзейнасцю ў грамадзе (сумленная праца, асвета, навучанне, сям'я, гасціннасць, гаспадарлівасць, ашчаднасць, мова, адказнасць, сумленнасць, салідарнасць);

2) рэфлексіўныя каштоўнасці, якія забяспечваюць самазахаванне, унутраную гармонію чалавека, накіраваныя на духоўнае асваенне рэчаіснасці і свайго месца ў ёй, а таксама каштоўнасныя арыентацыі, што выступаюць у якасці

© Жылко У. А., 2016

Репозиторий БарГУ

агульных светапоглядавых арыенціраў (хрысціянскі маральны ідэал (Бог), розум, годнасць, сумленнасць, сціпласць, свабода волі, патрыятызм, імкненне да самаўдасканалення, набыцця ведаў, памяць аб продках, краса як эстэтычнае абагульненне прыгожага ў самасвядомасці, зямля і прырода як сакральныя сферы, што забяспечваюць укаранёнасць, далучанасць да свайго месца, роднага кута), этычнае і эстэтычнае іх разуменне, мова як самакаштоўнасная сістэма.

Дыскурс твораў Я. Чачота дазваляе на прыкладах выявіць увасобленыя ў мастацкіх тэкстах аб’екты духоўнай культуры. Сярод іх цэнтральнае месца займае духоўны ідэал, што цалкам адпавядае сутнасці рамантычнай ідэалогіі. Ідэал можна вызначыць як ідэальны вобраз, які мае нарматыўны характар і вызначае паводзіны і дзейнасць людзей. У межах духоўнай культуры ідэал выступае пастулатам духоўнага жыцця, ён не суадносіцца непасрэдным чынам з канкрэтнай матэрыяльнай практыкай. Ідэалы — важныя элементы светапогляду, якія поруч з ідэямі, канцэптуальнымі вобразамі ствараюць пэўную карціну свету і чалавека [1, с. 36].

Арыентуючыся на ідэалы, чалавек вызначае мэты і задачы жыцця, практычнага пераўтварэння свету і сябе. Найперш гэта назіраецца праз такую рамантычную дамінанту як «двухсветавасць» — супрацьпастаўленне рэальнага і ўяўнага свету. Рэчаіснасць з яе ўтылітарнасцю і бездухоўнасцю адмаўляецца прадстаўнікамі рамантызму, замест яе сцвярджэнне набывае ўяўны свет, «іншасвет», ідэальны свет. Імкненне да жаданага ідэалу, які рухае чалавека, накіроўвае яго дзейнасць, у марах і памкненнях фактычна супадае з першасным аб’ектам ідэацыйнай культуры, у якасці якога выступае ідэал (прынамсі, ідэал духоўны). Уцёкі ад рэальнасці ў свет уяўленняў цесна звязаны з такой уласцівасцю чалавечага духу, як пачуццё бясконцага, якое, па сутнасці, з’яўляецца першакрыніцай рамантычнага светаадчування, што абумовіла такую рысу рамантычнага мастацтва, як «імкненне канечнага да бясконцага». Бясконцасць у ідэацыйнай культуры атаясамліваецца з Вечнасцю, вечным звышнатуральным быццём (Богам, абсалютам, тым, што знаходзіцца па-за часам).

Менавіта праз Боскі ідэал Я. Чачот спрабуе данесці да чытача галоўную ідэю сваёй творчасці: удасканаленне, пераўтварэнне рэчаіснасці на аснове Боскіх запаведзей і маральнасці, адраджэнне праз імкненне да асветы гуманістычных каштоўнасцей і, як вынік, пабудова на іх аснове ідэальнага жыцця. Паводле Я. Чачота, рэлігія не толькі аб’ядноўвае людзей з Творцам, яна не толькі ўцеха і вышэйшая асалода для сэрцаў, знясіленых пад цяжарам няшчасцяў і чалавечых заган, але і шчыт супраць варожых грамадству яго членаў, яна — краевугольны камень, на які абапіраецца мараль і тленнае шчасце [2, с. 170].

Вера ў Бога ў творчасці Я. Чачота сімвалізуе вечнасць, з’яўляецца каштоўнасным арыенцірам, своеасаблівым пунктам адліку абсалютнай сістэмы каардынат, вакол якога працякае жыццё беларуса з усімі яго прыватнымі каштоўнасцямі: «Вера наша, хрысціянства! / Шмат ты ран крывавых мела, / Покуль сэрцы ўсе ў паганскай / У Літве заняць здалела» [3].

Каштоўнасныя арыентацыі беларусаў грунтаваліся на спрадвечных хрысціянскіх запаведзях. Хрысціянская традыцыя лёгка ўспрымалася прадстаўнікамі этнасу з самага дзяцінства. У Богу бачылі перш за ўсё звышнатуральную сілу, абаронцу і караючую далонь, якая вызначае лёс, папярэджвае людзей пра сваю волю праз таямнічыя знакі. Нябесны патрон суправаджаў беларуса літаральна на кожным кроку. Паводле М. Крукоўскага, ідэя Бога мае «ўніверсальны характар, і ў ёй, як у вяршыні піраміды, канцэнтруюцца як законы прыроды, так і ўсе ідэалы і духоўныя каштоўнасці чалавецтва…» [4, с. 17]. Сам Я. Чачот неаднаразова падкрэслівае вызначальную ролю Бога ў каштоўнасным змесце ўсяго існага. Доказам таго могуць служыць некаторыя з вершаў, створаных на народнай аснове: «Божа, ты наш вечны пане, / Прымі ад нас павітанне. / Уся зямля слонцам ззяе, / З ясным небам размаўляе, // Што ўсё гэта тваім дарам, / Што ты света гаспадарам. / Блаславі ўсе людзі, / Няхай усім добра будзе!» [5].

Духоўны Боскі ідэал транслюецца праз сістэму каштоўнасцей, якія таксама выступаюць аб’ектамі духоўнай культуры і яскрава выяўляюцца ў творчай спадчыне Я. Чачота. Вядома, што менавіта рэлігійны светапогляд найбольш засяроджвае чалавека на сістэме яго каштоўнасных арыентацый. Зусім невыпадкова, што большасць вылучаных намі аксіялагічных дамінант духоўнай культуры, увасобленых ў творчасці Я. Чачота, абумоўлены якраз хрысціянскай сістэмай светапогляду.

Так, адной з дамінуючых каштоўнасцей у хрысціянстве выступае жыццё. Як вядома, жыццё — каштоўнасць, дадзеная Богам, і пазбавіцца яе па ўласным жаданні ёсць вялікі грэх, яшчэ большы грэх — пазбавіць жыцця іншага чалавека праз уласную прагу да лёгкага абагачэння, як менавіта і адбылося ў вядомай баладзе Я. Чачота «Свіцязь»: «Як будзе ў дарозе да мэты / Жыццё хоць чыё перашкодай, / Чым звесці са свету другога / Сябе лепей знішчы самога! < … > Усім мне давесці патрэбна / Адно: забіваць — найганебна» [6].

Цэнтральнай каштоўнасцю хрысціянства, яго вызначальным пастулатам з’яўляецца любоў ва ўсіх яе праявах: любоў да бліжняга, каханне да дзяўчыны, любоў да Радзімы. Менавіта любоў і літасць да бліжняга выступае фактарам яднання, трывалым падмуркам чалавечага жыцця, каштоўнаснай першаасновай. Любоў да бліжняга выступае ў творчасці Я. Чачота аб’яднальным чыннікам. У большасці сваіх вершаў паэт заклікае да ўзаемаразумення паміж панамі і сялянамі, напрыклад, у вершы «Дабрачынным панам і іх аканомам, што клапоцяцца пра добры быт сялян»: «Бог, што вам калісь даверыў, / Дбаць пра ўсіх сялян, пра лёс іх, / За дабро надзеліць шчасцем / На зямлі і ў нябёсах» [7].

Сукупнасць каштоўнасцей як аб’ектыўна значных духоўных структур задавала сістэму адліку для пазнання і дзеяння. Маральная матывацыя ў многім вызначала паводзіны беларуса ў творчасці і ў паўсядзённым жыцці, з цягам часу яна сфарміравала асаблівыя адносіны да працы і гаспадарчай дзейнасці ў цэлым. Праца ў хрысціянскай традыцыі спрадвеку выступала адным з галоўных сродкаў выратавання душы. Працавітасць лічыцца адной з самых станоўчых і дамінуючых рыс характару беларуса. Успрыманне жыцця як працы ў беларускай народнай культуры было звязана з тым, што такі лад жыцця быў дадзены Богам, які таксама ўспрымаўся беларусам як майстар і творца, дбайны, руплівы гаспадар над усім існым [8, с. 153]. Добрасумленная праца з’яўляецца неад’емным маральным складнікам аксіялагічнага

Репозиторий БарГУ

комплекса творчасці Я. Чачота. У большасці сваіх вершаў паэт заклікае да стараннай працы, паколькі ён цалкам перакананы ў боскай адметнасці любой стваральнай дзейнасці (называе яе «Божым дарам»: «Не на тое Бог стварыў, / Каб ты толькі еў і піў, / Але штобы працаваў, / Баранаваў і араў» [9]; «Працуйма, дзеткі, шчыра / ў дома чы ў дварэ; / Не спіць чалавек добры / Пры рабоце нігдзе» [10]. Праца на карысць іншага чалавека (праца на гаспадара, на пана выразна падкрэслівала агульначалавечую накіраванасць беларускай аксіялогіі. Агульнае па шкале каштоўнасцей беларускай духоўнай культуры ацэньваецца вышэй за асабістае. Паводле А. Шапенгаўэра, адсутнасць усякай эгаістычнай матывацыі ёсць крытэрый учынка маральнай каштоўнасці, што «спачуванне ёсць адзінай крыніцай такіх учынкаў, калі яны маюць маральную каштоўнасць, г. зн. пазбаўлены ўсякіх эгаістычных матываў» [11, с. 252].

Быць працавітым і руплівым для Я. Чачота — адна з маральных ісцін, якія павінны вызначаць жыццёвы ўклад кожнага чалавека. Разам з каштоўнасным асэнсаваннем катэгорыі працы да аксіялагічных аб’ектаў духоўнай культуры можна аднесці некаторыя рысы народнага характару, якія разглядаюцца ў этычным ключы: сціпласць, ашчаднасць, гаспадарлівасць. Узорам гаспадыні можна лічыць Анцуту з балады «Калдычэўскі шчупак»: «Рабіць усё умела — і прала, / і шыла, на кухні ўсё гатавала. / Сувоі палотнаў на лузе бяліла, / Сама агарод засявала» [12].

Не апошняе месца ў творчасці Я. Чачота займаюць праявы лакальнага патрыятызму, заклікі да служэння роднаму краю, якія таксама з’яўляюцца вызначальнымі ў якасці каштоўнасных арыентацый як аб’ектаў духоўнай культуры. У шматлікіх спевах-закліках да сяброў па таварыстве рэфрэнам гучыць думка: «Кожны з нас Айчыне / пасЛужыць павінен, / Свету, добрым людзям, / Славу так здабудзем» [13].

У аксіялагеме Радзімы ўвасоблена таксама значная духоўная каштоўнасць — памяць аб продках, сваіх каранях. У беларускай традыцыі продкі выступаюць носьбітамі духоўнага пачатку, прадстаўнікамі сакральнай сферы, найбольш набліжанымі да Бога, якім пашчасціла дасягнуць «вечнага і нятленнага свету». Таму продак выступае каардынатарам жыцця, на якога прынята было раўняцца, арыентавацца, як на ўзор: «Жыві ж, брат, здаровы ты з любаю жонкай / І дом свой за час найкароткі / Напоўні вясёлай дзіцячай гамонкай, / Працуй і рыбач так, як продак!» [14].

Божым дарам і вызначальнай прычынай ідэльнага жыцця ў трактоўцы паэта выступае імкненне да асветы, да спасціжэння сутнасці рэчаў шляхам самаразвіцця і навучання, пра што сведчыць не толькі мастацкая спадчына Я. Чачота, але і ўсім вядомы ўдзел яго ў філаматцкім згуртаванні: «Я з сэрцам удзячным дар шчодры во гэты / Кладу перад вамі і мрою: / Калі і для вас блісне промень асветы, / Вы возьмеце дар мой з сабою» [15].

Падводзячы вынік усяму сказанаму, можна аб’яднаць комплекс шматлікіх аб’ектаў духоўнай культуры, выяўленых у творчай спадчыне Я. Чачота, яго вершаванымі радкамі, якія выступаюць увасабленнем маральнага ідэалу светапогляду паэта, адмысловым алгарытмам у дасягненні шчаслівага жыцця: «Так, Божыя слугі жыць сціпла павінны, / Быць шчырымі, роўнымі з людам, / Пра душы, пра добрае дбаць штохвілінна, / І быць у паводзінах цудам» [16].

**Заключэнне.** Творчая спадчына Яна Чачота, аднаго з яскравых прадстаўнікоў беларускай рамантычнай традыцыі, з’яўляецца ўвасабленнем шматлікіх аб’ектаў духоўнай культуры, што найперш абумоўлена ў рамантычнай накіраванасці пісьменніцкай філасофіі з яе дамінацыяй духоўных патэнцый. Рэфлексійная дзейнасць Яна Чачота, выяўленая ў яго літаратурнай творчасці праз духоўны ідэал, сукупнасць каштоўнасцей і каштоўнасных арыентацый, выразна зарыентавана на сцвярджэнне маральна-этычных асноў ідэальнага жыцця, пра што сведчыць каштоўнаснае асэнсаванне такіх катэгорый, як жыццё, праца, Радзіма, асвета, Бог. Вылучаныя аксіялагемы складаюць адмысловую «праграму жыццяўстойлівасці», якая забяспечвае пазачасавае перманентнае гарманічнае існаванне чалавека (прадстаўніка этнічнай супольнасці) у зменлівай рэчаіснасці. У прадстаўленых аксіялагічных складніках выяўляецца падкрэслена сінтэзаваны народна-хрысціянскі характар, што абумоўлена ў арганічным перапляценні іх у межах вуснапаэтычнай традыцыі народа, а таксама ў сістэме рэлігійна-светапоглядавых арыентацый індывідуальных суб’ектаў культуры. Для інтэрпрэтацыі большасці аксіялагем, выяўленых у мастацкіх творах, характэрна падкрэсліванне агульначалавечай накіраванасці каштоўнасцей, калі супольнае лічылася больш значным за асабістае.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. Сорокин П. А. Социальная и культурная динамика. М. : Астрель, 2006. 1176 с.
2. Чачот Я. Свіцязь : выбр. тв. Мінск : БелЭн, 1999. 220 с.
3. Там жа. С. 132.
4. Крукоўскі М. І. Філасофія культуры: уводзіны ў тэарэтычную культуралогію : вучэб. дапам. Мінск : Універсітэцкае, 2000. 192 с.
5. Чачот Я. Свіцязь. С. 165.
6. Там жа. С. 114.
7. Там жа. С. 52.
8. Чернявская Ю. В. Белорусы. От «тутэйшых» — к нации. Минск : ФУАинформ, 2010. 510 с.
9. Чачот Я. Свіцязь. С. 162.
10. Там жа. С. 161.
11. Шопенгауэр А. Свобода воли и нравственность. М. : Республика, 1992. 447 с.
12. Чачот Я. Свіцязь. С. 75.
13. Там жа. С. 26.
14. Там жа. С. 78.
15. Там жа. С. 46.
16. Там жа. С. 84.


Рэпазіторый БарДУ